*Вячаслаў Калацэй*

# «БЕРАГІНЯ» ЯК КУЗНІЦА ФАЛЬКЛАРЫСТЫЧНЫХ КАДРАЎ БЕЛАРУСІ

За 15-гадовую гісторыю Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» стаўся часткай сістэмы этнамастацкай адукацыі Беларусі. Многія дзеці-дыпламанты «Берагіні» – тыя, хто пераймаў ад носьбітаў традыцыі каранёвыя формы этнічнага мастацтва нашага народа, – пасля школы атрымалі якасную фалькларыстычную адукацыю на нашай кафедры, а пазней вярнуліся ў месцы бытавання традыцыі і зараз паспяхова забяспечваюць там яе ахову і перайманне на сваіх працоўных месцах. «Пуцёўка ў жыццё», якой стаўся ўдзел у гэтым фэсце, змадэлявала абранне прафесіі, фарміраванне асобы і актыўную жыццёвую пазіцыю носьбіта і захавальніка фальклору.

Сёння гэта – не аптымістычна-футуралагічнае праектаванне, а факт. Прыкладамі тут з'яўляюцца наступныя маладыя спецыялісты: **Ірына Глушэц** – метадыст па этнаграфіі і фальклоры Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці, актыўны ўдзельнік адраджэння ўнікальнага абраду ваджэння і пахавання «Стралы» і надзвычай цікавай аўтэнтычнай спеўнай сістэмы Веткаўшчыны; **Віталь Залатароў** – дырэктар Акцябрскага цэнтра дасуга Гомельскай вобласці; **Яна Нікалаенка** – выкладчык фальклору Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў; **Паліна Роўда** – выкладчык Стайскай дзіцячай школы мастацтваў Лепельскага раёна, удзельніца аднаўлення такіх з'яў традыцыі на Віцебшчыне, як Купалле і Жаніцьба Цярэшкі; **Вячаслаў Красулін** – аспірант БДУКМ, аўтар перыядычных аглядаў фалькларыстычных даследаванняў у выданнях «ЛіМ» і «Звязда»; **Юлія Кучвальская, Кацярына Блоцкая, Юлія Сахарчук** і **Вольга Караткевіч** – магістранты Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія даследуюць розныя аспекты заходнепалескага Купалля, вясельнай абраднасці і рэвіталізацыі каранёвай культуры нашага народа, дыпламанты-прызёры Рэспубліканскага конкурса навуковых работ студэнтаў 2013 года.

Лёсы гэтых апантаных каранёвым мастацтвам беларускага народа маладых людзей – былых юных дыпламантаў «Берагіні» і выпускнікоў нашай кафедры – прыклад плёну і найвялікай этнаэкалагічнай значнасці фестывалю для сацыякультурнай сферы краіны ў дзяржаўным маштабе. Сёння ўсе спробы звесці «Барагіню» да нязначнага рэгіянальнага другаяснага фэсту – сур'ёзнае злачынства супраць будучыні нашай краіны, яе стабільнасці і статусу запаведніка ўсходнеславянскай духоўнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ